УДК 355.013.3

**В. А. Астрога**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

# ПОГЛЯДЫ СУЧАСНЫХ РАСІЙСКІХ ВАЙСКОВЫХ ЭКСПЕРТАЎ НА ЭКАНАМІЧНЫЯ МЕТАДЫ І СРОДКІ ВЯДЗЕННЯ ВАЙНЫ

У артыкуле аналізуюцца даследаванні расійскіх ваенных тэарэтыкаў па праблеме выкарыстання эканамічных метадаў і сродкаў у сучасных міждзяржаўных канфліктах, размешчаныя на старонках тэарэтычнага часопіса Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі «Ваенная думка» ў 2010–2020 гг. Разгледжаны дзесяць публікацый, прысвечаных розным этапам, асаблівасцям падзей, якія адбываюцца, і будучых ваенных канфліктаў, у тым ліку тыпу «гібрыдных войнаў». Робіцца выснова, што большасць даследаванняў, нягледзячы на пэўную палітызаванасць, уяўляюць сабой каштоўныя вынікі арыгінальных і перспектыўных распрацовак, якія праводзяцца расійскімі ваеннымі экспертамі ў галіне тэорыі войнаў.

**Ключавыя словы:** вайна, гібрыдная вайна, эканамічныя метады вайны, ваенны эксперт, навуковае даследаванне, Расія.

**V. A. Ostroga**
Belarusian state university

# VIEWS OF MODERN RUSSIAN MILITARY EXPERTS ON ECONOMIC METHODS AND MEANS OF WARFARE

The article analyzes the research of Russian military theorists on the use of economic methods and means in modern interstate conflicts, published on the pages of the theoretical journal of the Ministry of defense of the Russian Federation “Military thought” in 2010–2020. Ten publications devoted to various stages and features of ongoing and future military conflicts, including the “hybrid wars” type, are considered. It is concluded that most of these studies, despite some politicization, represent valuable results of original and promising developments conducted by Russian military experts in the field of war theory.

**Key words:** War, hybrid war, economic methods of war, military expert, scientific research, Russia.

**Уводзіны.** Эканамічныя сродкі вядзення ваенных дзеянняў супраць ворага вядомыя вельмі даўно. Напрыклад, яшчэ ў Старажытнай Грэцыі выкарыстоўваліся метады гандлёвай блакады свайго супраціўніка, што даводзіла жыхароў варожай краіны да голаду і паражэння. Уздзеянне на эканоміку ў часы ваенных канфліктаў працягвалася і ў наступныя эпохі. На сённяшні час выкарыстанне эканамічных метадаў адной дзяржавы ў дачыненні да другой дастаткова шырока распаўсюджана, прычым іх імкнуцца ўжыць часам у першую чаргу. Гэтыя метады ўваходзяць у сучасны арсенал так званай гібрыднай вайны. Вайсковыя тэарэтыкі вывучаюць сутнасць метадаў сучаснай вайны і аналізуюць досвед іх выкарыстання. Падобныя даследаванні адбываюцца і ў Расіі. Погляды сучасных расійскіх вайсковых экспертаў аб эканамічных метадах вядзення вайны шырока адлюстраваны на старонках разнастайных вайскова-тэарэтычных перыёдыкаў Міністэрства абароны Расіі, у тым ліку «Военная мысль» («Вайсковая думка»). Гэты часопіс лічыцца найбольш аўтарытэтным і прызначаны для вышэйшага і старэйшага каманднага складу расійскіх Узброеных Сіл, навукоўцаў, выкладчыкаў і слухачоў вайсковых навучальных устаноў. Таму ў нашым артыкуле будзе дадзены агляд найбольш цікавых матэрыялаў, надрукаваных на яго старонках за апошняе дзесяцігоддзе і прысвечаных магчымасцям выкарыстання эканамічных метадаў барацьбы ў сучасных войнах.

**Асноўная частка.** Расійскія вайсковыя тэарэтыкі стала ажыццяўляюць даследаванні трансфармацыі феномена вайны ў сучасных умовах. Аднак можам канстатаваць, што іх інтарэс да праблемы выкарыстання эканамічных метадаў у канфлікце паміж дзяржавамі, які існаваў раней, пасля 2010 г. становіцца больш відавочным, і на старонках «Вайсковай думкі» подобны экспертны аналіз пачынае друкавацца ўсё часцей. Аналізуемая праблема разглядалася аўтарамі ў асноўным ў межах геапалітыкі, кшталтаў і спосабаў будучых ваенных канфліктаў, мадэлей гібрыдных войнаў. Тамсама адзначым, што найбольшы інтарэс вайсковых экспертаў Расіі ў разглядаемы перыяд выклікалі менавіта формы і характар узброеных канфліктаў будучыні.

Першай публікацыяй у мінулым дзесяцігоддзі ў гэтым кірунку можна лічыць артыкул С. А. Багданава «Вайскова-эканамічны складнік бяспекі дзяржавы» [1]. Аўтар аналізуе змест дзвюх расійскіх манаграфій, прысвечаных сутнасці вайскова-эканамічнай бяспекі дзяржавы і абгрунтаванню крытэрыяў адзнакі ўзроўню ў гэтай сферы бяспекі сучасных вядучых індустрыяльных дзяржаў і Расіі. Ён звяртае ўвагу на адну з асноўных форм забеспячэння вайскова-эканамічнай бяспекі – вайскова-эканамічнае супрацьборства, якое падтрымлівае бяспеку нацыянальнай гаспадаркі ў барацьбе, найперш узброенай, супрацьстаячых бакоў.

У 2011 г. быў апублікаваны артыкул А. В. Сяржантава і А. П. Мартафляка «Аналіз асаблівасцей сучасных ваенных канфліктаў». У ім аўтары, характарызуючы комплекснае выкарыстанне вайсковай сілы і сродкаў невайсковага характару, адзначылі, што ў сучасных ваенных канфліктах «часта выкарыстоўваліся і метады эканамічнай блакады дзяржавы, супраць якой ўжывалася ваенная сіла» [2, с. 42].

Праз год на старонках часопіса пабачыў свет артыкул С. Г. Чэкінава і С. А. Багданава «Пачатковыя перыяды войнаў і іх уплыў на падрыхтоўку да вайны будучага», дзе дастаткова шмат увагі надавалася эканамічным варункам вядзення сучасных узброеных канфліктаў. Так, аўтары пазначалі, што «ў сучасных умовах эканамічны фактар пераўтварыўся ў адзін са складаючых элементаў вайны. Формы і метады эканамічнай барацьбы ўсё шчыльней пераплятаюцца з узброенай барацьбой» [3, с. 20–21]. Усё гэта, на іх погляд, адбываецца на тле двух кірункаў: з аднаго боку – паглыблення міжнароднай інтэграцыі і фармавання глабальнай эканамічнай і інфармацыйнай прасторы, а з другога боку – абвастрэння канкурэнтнай барацьбы сусветных эканамічных і вайскова-палітычных цэнтраў (ЗША, Еўропа, Кітай, Індыя, Расія) за пашырэнне сфер уплыву і доступу да запасаў энергарэсурсаў. Напрыклад, лічыўся верагодным патэнцыяльны канфлікт з Расіяй і «краінамі Захаду» з-за арктычных рэсурсаў [3, с. 22].

Узгаданыя даследчыкі праз пэўны час апублікавалі новы артыкул «Аб характары і змесце вайны новага пакалення». У ім абагульняюцца думкі пэўнага кола тагачасных расійскіх вайсковых экспертаў адносна асаблівасцей падрыхтоўкі і вядзення войнаў у XXI ст. Напачатку свайго даследавання яны адзначылі, што «ўзрасла роля невайсковых спосабаў ў дасягненні палітычных і стратэгічных мэтаў, якія ў шэрагу выпадкаў па сваёй эфектыўнасці значна пераўзышлі моц зброі» [4, с. 13]. Аўтары не надавалі шмат увагі непасрэдна разгляду эканамічных сродкаў вядзення войнаў, засяроджваючы ўвагу найперш на разважаннях аб перспектывах інфармацыйна-псіхалагічнага супрацьстаяння, выкарыстання высокатэхналагічнай зброі з мінімальным удзелам чалавека і падкрэсліваюць, што «дасягненне мэты ў войнах будучага будзе не магчыма без заваявання інфармацыйнага панавання над супраціўнікам» [4, с. 14]. Але разам з тым яны падзялялі выснову расійскага вайсковага эксперта Сліпчэнкі У. І. аб войнах шостага пакалення, мэтай якіх будзе «разгром эканамічнага патэнцыялу супраціўніка» [4, с. 15].

В. А. Кісялёў падрыхтаваў вялікі канцэптуальны артыкул «Да якіх войнаў неабходна рыхтаваць Узброеныя Сілы Расіі», але эканамічныя сродкі і метады вядзеня вайны чамусьці засталіся па-за аналізам. Фактычна ён толькі канстатуе, што сучасным войнам папярэднічаюць дыпламатычныя, эканамічныя і фінансавыя акцыі [5, с. 38].

Цікавае і канцэптуальнае даследаванне правялі С. Г. Чэкінаў і С. А. Багданаў аб эвалюцыі сутнасці і зместу паняцця «вайна» ў XXI ст. Гэты артыкул быў першы на старонках часопіса, дзе так глыбока разглядаўся феномен і кшталты сучаснай вайны, а таксама выкарыстанне ў ёй эканамічных сродкаў. Аўтары адзначаюць, што ў войнах будучыні ўзрастае роля «несілавых відаў барацьбы», напрыклад эканамічнай [6, с. 32]. Выкарыстанне «нетрадыцыйных сродкаў дзеянняў у войнах, у тым ліку эканамічных, разам з гвалтоўным вайсковым кампанетам, з'яўляецца неад'емным атрыбутам усіх войнаў апошніх дзесяцігоддзяў» [6, с. 33]. Даследчыкі лічаць, што сучасны досвед дэманструе, што усё найбольш выразна пачынае праяўляцца тэндэнцыя змены прыярытэтаў розных кшталтаў моцы ў стасунках паміж дзяржавамі. На іх погляд, паступова вайсковая моц пачала выкарыстоўвацца на заключнай фазе супрацьборства, калі рэалізацыя іншых відаў моцы стварыла найбольш зручныя дзеля гэтага ўмовы альбо апынуліся неэфектыўнымі ў дасягненні пастаўленых мэтаў. А выкарыстанне эканамічных, дыпламатычных, ідэалагічных і іншых кшталтаў супрацьборства становіцца неабходнасцю і складовай часткай агульнага замыслу вайны [6, с. 34]. У сувязі з гэтым С. Г. Чэкінаў і С. А. Багданаў прапануюць не блытаць тэрміны «вайна» і «ўзброеная барацьба». Можна пагадзіцца з іх меркаваннем, што зараз ва ўмовах глабалізацыі сусветных працэсаў, вялізнага эканамічнага пераўзыходжання вядучых дзяржаў свету і моцнай фінансавай залежнасці ад іх іншых дзяржаў няма аб'ектыўнай неабходнасці ўчыняць буйнамаштабныя войны. Тым больш маюцца прыклады

дасягнення мэтаў міждзяржаўнага спаборніцтва без выкарыстання войска. Таму, пішуць аўтары, «у сучасных традыцыйных войнах дастаткова часта выкарыстоўваюцца метады палітычнай, эканамічнай, марской, паветранай блакады дзяржавы, супраць якой накіравана вайсковая моц» [6, с. 36].

Артыкул А. С. Фадзеева і У. І. Нічыпара «Ваенныя канфлікты сучаснасці, перспектывы развіцця сродкаў іх вядзення. Простыя і няпростыя дзеянні ва ўзброеных канфліктах XXI стагоддзя» адлюстроўвае новыя трэнды расійскіх вайсковых даследаванняў у разглядаемай сферы. Аўтары лічаць, што ў сучасным ваенным канфлікце дзяржавам, якія не дасягнулі дастаткова высокага тэхналагічнага ўзроўню сваіх узброеных сіл, неабходна выкарыстоўваць магчымасці «асіметрычных спосабаў» барацьбы с супраціўнікам, ў тым ліку канкрэтныя эканамічныя меры, хоць яны і носяць хуткабягучы характар, бо супраціўнік мае магчымаць хутка адаптавацца да іх і здзейсніць эфектыўнае супрацьдзеянне [7, с. 41]. Але гэты артыкул, у параўнанні з іншымі, мае палітызаваны характар, што зніжае яго каштоўнасць.

Адным з самых новых укладаў ў развіццё расійскай вайскова-тэарэтычнай думкі з'яўляецца даследаванне дыскусійнага характару «Навука аб вайне: перайマльнасць і сучаснае развіццё» Л. І. Альштынскага, дзе аўтар у рамках асэнсавання даследавання расійскага філосафа Цюшкевіча С. «Аб законах вайны. Пытанні тэорыі і метадалогіі» (2018) разважае пра паняцце «вайна». Аўтар у сваёй працы ўзгадвае тэрмін «эканамічная вайна», але лічыць яго немэтазгодным. Гэта, на яго погляд, галіна барацьбы ў мірны час. А тэрмін «вайна» можа быць выкарыстаны толькі ў спалучэнні з узброенай барацьбой [8, с. 121].

Гібрыдныя войны таксама прыцягвалі ўвагу расійскіх вайсковых навукоўцаў, даследаванні якіх у гэтай галіне пачалі актыўна з'яўляцца на старонках часопіса з 2015 г. Аднак першай публікацыяй, дзе ў кантэксце аналізу гібрыдных аперацый узгадваюцца эканамічныя формы ўдзелу ў падобнага кшталту канфліктах, быў артыкул А. А. Барташа «Трэнне» і «знос» гібрыднай вайны», ў якім аўтар увесь час ўзгадвае эканамічную сферу як вельмі важную падчас правядзення аперацый гібрыднай вайны, формы міжнародных канфліктаў новага пакалення, дзе суадносіны ваенных і неваенных відаў барацьбы складаюць 1 : 4 на карысць неваенных [9, с. 6].

У сваім наступным артыкуле «Стратэгія і контрстратэгія гібрыднай вайны» ён адзначае, што гібрыдная вайна – гэта феномен схаванага канфлікту, які цячэ ў выглядзе інтэграванага вайскова-палітычнага, фінансава-эканамічнага, інфармацыйнага і культурна-светапогляднага супрацьстаяння, які не мае пэўнага статуса [10, с. 5]. У прыватнасці, пры мінімальным узроўні вайсковага гвалту адбываецца канцэнтраваны ціск у фінансана-эканамічнай сферы. У сучасных умовах, піша А. А. Барташ, «вайна не абавязкова павінна асацыявацца з пачаткам ваенных дзеянняў – працяг палітыкі можа ажыццяўляцца гвалтоўным шляхам не толькі вайсковымі, але і невайсковымі сродкамі» [10, с. 6]. На сённяшні дзень, як лічыць А. А. Барташ, «сярод палітыкаў і военачальнікаў замацоўваецца пункт погляду, што вяваць на полі бою – справа няўдачнікаў у палітыцы і стратэгіі» [10, с. 12].

**Заключэнне.** Такім чынам, расійскія вайсковыя тэарэтыкі звяртаюць усё большую ўвагу на аналіз выкарыстання эканамічных метадаў і сродкаў у сучасных і будучых ваенных канфліктах, асабліва кшталту «гібрыдных войнаў». Большасць іх даследаванняў, нягледзячы на ўзрастаючую ў пэўнай частцы з іх з 2015 г. палітызаванасць, з'яўляюцца па сваім характары экспертнымі, змяшчаюць у сабе асэнсаваны досвед тых узброенных канфліктаў, у якіх удзельнічала Расія, альбо арыгінальную кропку гледжання на ваенныя падзеі па-за яе межамі. У гэтай сувязі вайскова-тэарэтычны часопіс Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі «Военная мысль» адлюстроўвае на сваіх старонках вынікі найбольш цікавых і перспектыўных даследаванняў у гэтай галіне.

## Спіс літаратуры

1. Богданов С. А. Военно-экономическая составляющая безопасности государства // Военная мысль. 2010. № 2. С. 3–9.

2. Сержантов А. В., Мартофляк А. П. Анализ особенностей современных военных конфликтов // Военная мысль. 2011. № 5. С. 36–44.

3. Чекинов С. Г., Богданов С. А. Начальные периоды войн и их влияние на подготовку страны к войне будущего // Военная мысль. 2012. № 11. С. 14–27.

4. Чекинов С. Г., Богданов С. А. О характере и содержании войны нового поколения // Военная мысль. 2013. № 10. С. 13–24.

5. Киселев В. А. К каким войнам необходимо готовить Вооруженные Силы России // Военная мысль. 2017. № 3. С. 37–46.

6. Чекинов С. Г., Богданов С. А. Эволюция сущности и содержания понятия «война» в XXI столетии // Военная мысль. 2017. № 1. С. 30–43.

7. Фадеев А. С., Ничипор В. И. Военные конфликты современности, перспективы развития способов их ведения. Прямые и непрямые действия в вооруженных конфликтах XXI века // Военная мысль. 2019. № 9. С. 33–41.

8. Ольштынский Л. И. Наука о войне: преемственность и современное развитие // Военная мысль. 2020. № 4. С. 115–123.

9. Бартош А. А. «Трение» и «износ» гибридной войны // Военная мысль. 2018. № 1. С. 5–13.

10. Бартош А. А. Стратегия и контрстратегия гибридной войны // Военная мысль. 2018. № 10. С. 5–20.

## References

1. Bogdanov S. A. The military-economic component of state security. *Voyennaya mysl'* [Military thought], 2010, no. 2, pp. 3–9 (In Russian).

2. Serzhantov A. V., Martoflyak A. P. Analysis of the characteristics of modern military conflicts. *Voyennaya mysl'* [Military thought], 2011, no. 5, pp. 36–44 (In Russian).

3. Chekinov S. G., Bogdanov S. A. The initial periods of wars and their impact on the preparation of the country for the war of the future. *Voyennaya mysl'* [Military thought], 2012, no. 11, pp. 14–27 (In Russian).

4. Chekinov S. G., Bogdanov S. A. On the nature and content of a new generation of war. *Voyennaya mysl'* [Military thought], 2013, no. 10, pp. 13–24 (In Russian).

5. Kiselev V. A. What wars should the Armed Forces of Russia be prepared for. *Voyennaya mysl'* [Military thought], 2017, no. 3, pp. 37–46 (In Russian).

6. Chekinov S. G., Bogdanov S. A. What wars should the Armed Forces of Russia be prepared for. *Voyennaya mysl'* [Military thought], 2017, no. 1, pp. 30–43 (In Russian).

7. Fadeev A. S., Nichipor V. I. Military conflicts of our time, prospects for the development of methods of their conduct. Direct and indirect actions in armed conflicts of the XXI century. *Voyennaya mysl'* [Military thought], 2019, no. 9, pp. 33–41 (In Russian).

8. Ol'shtynskiy L. I. The Science of War: Succession and Modern Development. *Voyennaya mysl'* [Military thought], 2020, no. 4, pp. 115–123 (In Russian).

9. Bartosh A. A. "Friction" and "wear" of hybrid warfare. *Voyennaya mysl'* [Military thought], 2018, no. 1, pp. 5–13 (In Russian).

10. Bartosh A. A. Strategy and Counterstrategy Hybrid Warfare. *Voyennaya mysl'* [Military thought], 2018, no. 10, pp. 5–20 (In Russian).

## Інфармацыя пра аўтара

**Астрога Віктар Аляксандравіч** – доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры мытнай справы. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (220030, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 4, Рэспубліка Беларусь). E-mail: ostroga.v@mail.ru

## Information about the author

**Ostroga Victor Alexandrovich** – DSc (History), Professor, Head of the Department of Customs Affairs. Belarusian State University (4, Nezavisimosti Ave., 220030, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: ostroga.v@mail.ru

*Паступіў 10.09.2020*